# РАЗДЕЛ 5
# ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА И ДИПЛОМАТИЯ БЕЛАРУСИ (1918–2018 гг.)

## ВІЦЕБСКАЯ ГУБЕРНЯ ПАМІЖ БССР І РСФСР

А.В. Бараноўскі (Мінск)

У канцы снежня 1918 г. на VI-й Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) было прынята рашэнне аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі, дадзенае рашэнне замацоўвалася ў Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г. У склад Беларускай рэспублікі ўвашлі Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская і Смаленская губерні. ССРБ павінна была стаць апошнім звяном у ланцугу фармальна незалежных савецкіх дзяржаў, якія аддзялілі б Савецкую Расію ад капіталістычных дзяржаў. Тым больш, што ў Польшчы пасля прыходу да ўлады Ю. Пілсудскага, быў узяты курс на падрыхтоўку ваеннай інтэрвенцыі ў савецкую Расію.

Адразу пасля абвяшчэння ССРБ з губерняў у ЦК РКП(б) пайшлі звароты з пратэстамі супраць утварэння рэспублікі і ўключэння ў яе склад. Найбольш непрымірымую пазіцыю адносна далучэння да Беларускай рэспублікі заняла Віцебская губернская партыйная арганізацыя. 2 студзеня ў Віцебску адбылося пасяджэнне партыйнага камітэта РКП(б), на якім мясцовае кіраўніцтва выказалася прынцыпова супраць стварэння Беларускай Рэспублікі [1, арк. 1].

Дадзенае рашэнне на месцах было падтрымана не ўсімі. Так, 4 студзеня адбыўся агульны сход Невельскай арганізацыі РКП(б), на якім прысутныя выступілі супраць пастановы Віцебскага губернскага партыйнага камітэта РКП(б) і падтрымалі пастанову І-га з’езда КП(б)Б. “Пастанова аб аддзяленні Віцебскай губерні і непрызнанні самой Беларусі з’яўляецца наступствам настойлівага імкнення Віцебскага камітэта супрацьпаставіць палітыцы ЦК і пастанове І-га з’езда камуністычнай арганізацыі Беларусі сваю асаблівую палітыку, якая ідзе на шкоду як расійскаму, так і міжнароднаму пралетарыяту” [2, арк. 7].

Нягледзячы на гэта, Віцебскі партыйны камітэт працягваў выступаць супраць стварэння ССРБ і ўваходжання ў яе склад Віцебскай губерні. Падчас пасяджэння партыйнага камітэта Віцебскай арганізацыі РКП(б) якое адбылося 9 студзеня, старшыня губкама С. М. Крылоў заявіў, што ў Маскву дэлегавана С. І. Шэйдліна, якая павінна там высветліць, ці можна будзе губернскаму з’езду Саветаў і канферэнцыі партыі падняць пытанне супраць стварэння Беларускай рэспублікі [1, арк. 4 аб.–5].



Рэпазіторый ВДУ

С. І. Шейдліна вярнулася з Масквы 20 студзеня і азнаёміла партыйны камітэт з рашэннем Цэнтра аб выдзяленні Віцебскай губерні са складу ССРБ і далучэнні да РСФСР. У той жа дзень, адпаведная пастанова была прынята на III Віцебскай губернскай партыйнай канферэнцыі [1, арк. 8]. У рэзалюцыі партыйнай канферэнцыі адзначалася: “Як вядома, на І з’ездзе камуністаў Беларускай Рэспублікі было вырашана замест Заходняй камуны арганізаваць Беларускую Рэспубліку, у склад якой павінна была ўвайсці і Віцебская губерня. Мы ж, абмеркаваўшы гэтае пытанне на месцы, прыйшлі да такой высновы, што Віцебская губерня нічога агульнага не мае з Беларуссю, насельніцтва зусім абрусела, а таму і было вырашана вітаць вылучэнне Віцебскай губерні са складу Беларускай ССР” [3, арк. 40]. Праз два дні Віцебскі губкам РКП(б) накіраваў тэлеграму ў ЦК РКП(б) аб выдзяленні са складу ССРБ. 27 студзеня Цэнтральнае Бюро КП(б)Б, заслухаўшы рэзалюцыю партыйнай канферэнцыі Віцебскай губерні аб неўваходжанні ў склад Беларусі, пастанавіла адмовіцца, як у савецкіх, так і ў партыйных адносінах ад Віцебскай губерні, даўшы апошняй поўную свабоду звязвацца непасрэдна з Цэнтрам ці ўваходзіць у іншае абласное аб’яднанне [4, с. 87].

2–3 лютага ў Мінску адбыўся І Усебеларускі з’езд Саветаў, які пагадзіўся з жаданнем Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў застацца ў складзе РСФСР. Пры гэтым улады Віцебскай губерні лічылі пытанне настолькі прадвызначаным, а сам з’езд чыстай фармальнасцю, што адмовіліся пасылаць сваю дэлегацыю ў Мінск [5, с. 153].

Можна вылучыць некалькі прычын вяртання Віцебскай губерні ў склад Савецкай Расіі асобна з боку РСФСР, БССР і Віцебскай губерні.

Для Савецкай Расіі склалася неспрыяльная знешнепалітычная абстаноўка. Польшча прэтэндавала на беларускія землі і адмаўлялася прызнаць ССРБ. Кіраўніцтва РКП(б) дапускала магчымасць ахвяры беларускімі землямі, але не ўсёй тэрыторыяй, таму і было вырашана вярнуць Віцебскую, а таксама Магілёўскую і Смаленскую губерні ў склад РСФСР. Губерні, якія вярталіся Савецкай Расіі, мелі таксама важнае значэнне ў забеспячэнні харчаваннем цэнтральных раёнаў Расіі. На думку, беларускага гісторыка С. Хоміча, ЦК РКП(б) не мог не хваляваць магчымы рост сепаратысцкіх настрояў і ўнутрыпалітычная сітуацыя, канфлікт паміж групамі А. Мяснікова і Д. Жылуновіча.

Ідэя абмежавання тэрыторыі ССРБ не была ўспрынятая ні групай Мяснікова, ні прыхільнікамі Жылуновіча. Калі б не было гэтага ўнутранага расколу і выступі абедзве групы з адзінай пазіцыяй, магчыма, што ЦК РКП(б) прыйшлося б адмовіцца ад ідэі аддзялення некалькіх губерняў ад ССРБ. Згода ЦБ КП(б)Б на перадачу Віцебскай губерні ў склад РСФСР тлумачыцца тым, што менавіта Віцебская партыйная арганізацыя заняла найбольш непрымальную пазіцыю адносна далучэння да ССРБ.



Репозиторий ВГУ

Сярод кіраўнікоў Віцебскай губерні пераважалі выхадцы з цэнтральных рэгіёнаў Расіі. Ім былі зразумелы ўнутраныя сувязі з Масквой і Петраградам. Цэнтр адыгрываў велізарную ролю ў эканамічных адносінах для губерні. Віцебскае партыйнае кіраўніцтва адзначала, што ў выпадку канчатковага далучэння да ССРБ прыйдзецца ламаць сваю гаспадарку. "Беларусь краіна не прамысловая, яна самая адсталая, яна цалкам далучылася да цэнтральнай Расіі, і калі мы аддзелімся, то станем на шлях небяспечны".

Такім чынам, рашэнне аб далучэнні Віцебскай губерніі да РСФСР прымалася з палітычнага і эканамічнага пункту гледжання, а не нацыянальнага.

У далейшым партыйнае кіраўніцтва Віцебскай губерні не лічыла беларускае пытанне годным увагі. Спробы прыхільнікаў беларускай культуры наладзіць у губерні беларускую работу сустракалі неразуменне і супрацьдзеянне мясцовых уладаў. Кіраўніцтва Беларускай Рэспублікі неаднаразова звярталася ў ЦК РКП(б), з просьбай пакласці канец ціску на беларускую работу.

У 1921 г. у Наркамат асветы БССР прыйшоў ліст з Лепельскага павятовага Саюза працоўнай асветы Віцебскай губерні. У ім праўленне Саюза прасіла растлумачыць, ці з'яўляецца злачынствам этнаграфічнае даследаванні краю і пастаноўка п'ес на беларускай мове. Аўтары звароту адзначалі, што работа ў галіне беларускай культуры паралізуецца тым, што лічыцца ўладамі контррэвалюцыйнай, а за людзьмі, якія ёю займаюцца, вядзецца пільнаеназіранне.

Жадаючы азнаёміцца з пастаноўкай беларускай культурна-асветніцкай работы ў Віцебскай губерні, Віцебск ў 1922 г. наведаў наркам асветы БССР У. Ігнатоўскі. Ён быў здзіўлены поўнай адсутнасцю беларускай работы ў губерні, насельніцтва якой у асноўным беларускае. Дакладная запіска была перададзена нават І. Сталіну, аднак ніякай рэакцыі не было [5, с. 229].

У маі 1923 г. ЦК РКП(б) разглядзеў пытанне аб межах БССР і даў згоду на яго далейшую распрацоўку. Менавіта з гэтага часу пачалася актыўная праца па вяртанні ўсходнебеларускіх зямель у склад БССР. На месцах пачало актыўна абмяркоўвацца дадзенае пытанне. з найбольшым энтузіязмам да ўваходжання Віцебскай губерні ў склад БССР аднеслася мясцовая інтэлігенцыя. Настаўнікі, работнікі адукацыйных і культурных ўстаноў, пачынаючы з 1923 г., віталі далучэнне да Беларускай рэспублікі. Што тычыцца працоўных і сялян, то большасць з іх выступала супраць далучэння да БССР. Іх турбавала, што ўваходжанне ў склад Беларускай рэспублікі адмоўна адаб'ецца на іх матэрыяльным становішчы. Праз год рабочыя і сяляне ўзбуйненне БССР успрынялі як факт, які адбыўся, бо разумелі, што ўсе рашэнні былі прынятыя ў Цэнтры і іх не змяніць.

Адмоўна да вяртання Віцебскай губерні ў склад БССР аднеслася і мясцовае кіраўніцтва. Гэта абумоўлівалася некалькімі прычынамі. Па-



Рэпазіторый ВДУ

першае, значная частка кіраўніцтва губерні была накіравана ў Віцебск з іншых рэгіёнаў Савецкай Расіі, у сувязі з гэтым яны разглядалі беларускія землі як неад'емную частку РСФСР. Па-другое, партыйныя і савецкія работнікі асцерагаліся страціць свае пасады, паколькі ў выпадку далучэння губерні рэарганізацыя непазбежная. Па-трэцяе, далучэнне да БССР азначала неабходнасць вывучэння беларускай мовы адказнымі работнікамі, а гэта ў сваю чаргу моцна турбавала і раздражняла многіх.

29 лістапада 1923 г. Палітбюро ЦК РКП(б) разглядзела прапанову Аргбюро і пастанавіла далучыць да БССР "роднасныя ёй у бытавых, этнаграфічных і гаспадарча-эканамічных адносінах тэрыторыі", у тым ліку цалкам Віцебскую губерню. Аднак рашэнне Палітбюро ЦК РКП(б) было перагледжанага Камісіяй ЦВК СССР па змяненні межаў паміж РСФСР і БССР, Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні было вырашана пакінуць у складзе РСФСР. З гэтым беларускія ўлады былі катэгарычна не згодныя, таму 18 снежня А. Г. Чарвякоў накіраваў запіску ў ЦК РКП (б) "Аб стаўленні Камісіі ЦВК СССР да пастановы Палітбюро ЦК РКП(б) аб узбуйненні БССР", у якой указаў, што камісія ЦВК СССР, нягледзячы на пратэст прадстаўнікоў Беларусі, падвергла другаснаму абмеркаванню пытанне аб паветах і прыняла шэраг рашэнняў, якія супярэчаць пастанове Палітбюро [4, с. 210].

У гэты ж дзень, у Маскве, адбылося пасяджэнне Камісіі ЦВК СССР па змяненні межаў паміж РСФСР і БССР. Беларускі бок настойваў на далучэнні Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў да БССР. На наступны дзень, 19 снежня, старшыня Камісіі ЦВК СССР па змяненні межаў паміж РСФСР і БССР А. Енукідзе накіраваў ліст у Палітбюро ЦК РКП(б) "Аб рознагалоссях паміж членамі Камісіі", у якім гаварылася, што члены камісіі не прыйшлі да адзінагалоснага рашэнні па трох паветах Віцебскай губерні, якія па рашэнні большасці камісіі застаюцца ў межах РСФСР па дзвюх прычынах: па-першае, сярод насельніцтва ў гэтых паветах колькасць беларусаў не перавышае 33%, а па-другое, эканамічна гэтыя паветы імкнуцца да Пскоўскай губерні.

13 лютага 1924 г. Прэзідыум УЦВК адхіліў хадайніцтва Беларускага ЦВК аб перадачы БССР Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў Віцебскай губерні, бо для гэтага няма падстаў [?]. 4 сакавіка Прэзідыум УЦВК пастанавіў перадаць БССР па старым (да 1922 г.) адміністрацыйным дзяленні Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Аршанскі, Полацкі, Сенненскі і Суражскі паветы Віцебскай губерні. Канчатковае рашэнне па Веліжскаму, Невельскаму і Себежскаму паветах было прынята 24 сакавіка 1924 г. на пасяджэнні Прэзідыума УЦВК. Дадзеныя паветы перадаваліся ў склад Пскоўскай губерні [6].

Старшыня Віцебскага губернскага выканаўчага камітэта Д. Прышчэпаў разам са старшынёй паўнамоцнай камісіі СНК БССР па



Репозиторий ВГУ

прыёме тэрыторыі Віцебскай губерні І. Адамовічам падпісалі акт аб далучэнні губерні да БССР.

Такім чынам, Віцебская губерня ў пачатку ХХ ст. некалькі разоў мяняла сваю дзяржаўную прыналежнасць. У сакавіку 1924 г. губерня была канчаткова перададзена ў склад БССР. На наш погляд, існавала некалькі прычын перадачы часткі тэрыторый РСФСР у склад БССР. Па-першае, неабходнасць пашырэння Беларускай Рэспублікі тлумачылася перш за ўсё меркаваннямі знешнепалітычнага характару. Пасля Рыжскай мірнай дамовы значная частка беларускіх зямель апынулася ў Польшчы. Кіраўніцтва БССР прыкладала значныя намаганні, каб стварыць і падтрымаць сярод насельніцтва Заходняй Беларусі прасавецкія настроі. Узбуйненне БССР у сваю чаргу падымала пытанне аб вяртанні тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Па-другое, меркаванні знешнепалітычнага характару падмацоўваліся ўнутрыпалітычнымі і эканамічнымі момантамі. Кіраўніцтва БССР таксама спасылалася на кепскі стан, у якім знаходзілася нацыянальная работа ў беларускіх губернях, уключаных у склад РСФСР.


*Крыніцы і літаратура:*

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Ф. 10050-п. Воп.1. Спр. 27.
2. ДАВВ. – Ф. 10050-п. Воп.1. Спр. 15.
3. ДАВВ. – Ф. 10050-п. Воп.1. Спр. 22.
4. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост.: В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – Т. 1 (март 1917 – ноябрь 1926). – 495 с.
5. Хомич, С. Н. Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке: от незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo / С. Н. Хомич – Минск : Экономпресс, 2011. – 415 с.
6. Барановский, А. В. К вопросу о передаче Велижского, Невельского и Себежского уездов Витебской губернии в состав Псковской в 1920-х годах / А. В. Барановский // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сб. науч. тр. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2017. – Т. 23. – С. 47–53.


## ОБ ИСТОКАХ ФОРМИРОВАНИЯ АРХИВА МИД РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

С.Ф. Свилас (Минск)

Руководство МИД БССР в первые двадцать лет функционирования министерства (К. В. Киселев, П. Е. Астапенко, А. Е. Гуринович) рассматривало работу по созданию системы хранения и пользования архивными документами как важное направление своей деятельности, вносило этот вопрос в повестку заседаний Коллегии и референтских совещаний, систематизировало материал о состоянии фонда в годовых отчетах. На формирование архива внешнеполитического ведомства существенное влияние оказало сотрудничество Белорусской ССР с Международным советом архивов, а также тесное

Репозиторий ВГУ